съемками – горы, восход солнца, тростник, гнущийся на ветру. Появление этих кадров, которое казалось бы, нелогично в середине ролика, с одной стороны связано с особой художественно-эстетической традицией. С другой, - это своего рода запуск механизма включения многоплановости восприятия мира в его многообразии и единстве. Это находит свое выражение в богатстве и сложности воображения, которое формировалось в рамках многомерного культурного контекста, и которое погружено в атмосферу своего прошлого, своих мотивов и своих культурных устоев. В таких культурах, обладающих предельно насыщенным символическим содержанием, реклама из утилитарного способа продвижения товара и формирования потребительского спроса превращается в устойчивый механизм коммуникации и даже социальной идентификации. При этом семантика продвигаемого товара выходит далеко за пределы его функциональных качеств.

Изменения, происходящие в мире, так или иначе, затрагивают все стороны нашей жизни. Традиционные страны в одночасье занимают новое и отнюдь не последнее место в мире. Произойдет ли в результате всего этого утрата национальной идентичности культурных традиций или культурный код сыграет роль охранительного механизма национального своеобразия и неисчерпаемости, связи традиции и прогресса/

Литература


1. Лотман, Ю. М. Семиосфера / Ю. М. Лотман. – СПб, 2010.
2. Клотер, Р. Культурный код: Как мы живем, что покупаем и почему / Р. Клотер. – М., 2008.
3. Шпенглер, О. Закат Европы / О. Шпенглер. - М., 1993.
4. Юнг, К. Г.. Архетип и символ / К. Г. Юнг. - М:, 1991.


***Анцыповіч М. В.*** **Філасофскія ўяўленні ў “Казках жыцця” Якуба Коласа**

У творчай свядомасці паэтаў расліннае покрыва айчыннай зямлі прысутнічае як феномен шматграннага мастацкага ўвасаблення “адчування радзімы”, засваення нацыянальных і сусветна значных традыцый, пераймальных гісторыка – культурных і побытавых каштоўнасцей. Зварот да свету раслін, як да адной з асноў быцця і

галоўнай прыкметы радзімы, ўласцівы для шматлікіх перыядаў літаратуры, пачынаючы ад Ф. Скарыны. Ідэя глыбокай духоўнай залежнасці нацыянальнага ўклада ад расліннага свету прасочваецца ў творчасці беларускага паэта – лацініста Міколы Гусоўскага. //Сосны ў нас гоніць у ствол, як трыснёг у сцябліну; // Хмаркі здаецца, павіслі і на макаўках кронаў.// Водарам кветак з вясны і да позняга лета //Пушча напоена, нетры яе і прылескі - //Месцы ігрышчаў і гульбішчаў моладзі сельскай.// Бортнікі нашы на стаўках – разлапістых соснах – //Ставяць вуллі, а часам і ў дрэве пад верхам// Выдзяўбуць долатам борці і лётвы прыладзяць // [1, с. 32]. Па свойму быў захоплены раслінным светам Я. Колас. Не выпадкова адзін з самых вядомых яго твораў мае назву "Новая зямля". Колас тонка адчуваў прыроду, ён майстар пейзажных замалёвак. "Эх, луг шырокі! Як жывы , ты,// Праменнем сонейка заліты,//Увесь стаіш перад вачыма,// Ты міл і смуцен, як радзіма// Як наша ціхая старонка, //Дзе смугі сіняя пялёнка //У летні час дымком звісае//І даль задумай спавівае// [2, с. 6 ].

У шматвоблічнай спадчыне Якуба Коласа значнае месца займаюць "Казкі жыцця", над якімі пісьменнік працаваў на працягу ўсяго творчага шляху. Першая з казак – "Жывая вада" – ўбачыла свет на старонках "Нашай нівы" ў 1907г., апошнія творы ў гэтым казачна – алегарычным жанры былі створаны Я. Коласам у 1956 г. Выспяванне сацыяльнай і нацыянальнай свядомасці беларускага народа, разважанні над адвечнымі пытаннямі быцця, накшталт, жыццё і смерць, прырода і чалавек, чалавек і народ, – гэта асноўная праблематыка коласаўскіх казак, і выражаецца яна часцей за ўсё ў формах фальклёрнана матэрыяла. У ва ўсёй разнастайнасці расліннага свету ў "Казках жыцця" найбольш часта прыцягваюць увагу дрэвы, хмызнякі, кустоў'е ў сілу іх эстэтычнай выразнасці. Гэта тлумачыцца роллю канцэпцыі Сусветнага дрэва, якая атаясамліваецца ў беларускай гісторыі з дубам. Хрысціянская культурная традыцыя зберагла пераймальную сувязь з паганствам у той яго частцы, якая тычыцца міфалагемы Сусветнага дрэва.

У казцы "Адзінокае дрэва" (1912 г.) гаворыцца пра Дуб, да якога ціснуліся ў сябры Вецер і Ручай , але на самай справе адзін размываў яго карэнне, другі – ірваў лісце і галіны, гатоў быў вывярнуць яго з зямлі. Па коласаўскіх уяўленнях дрэва – гэта душа чалавека, за якую змагаюцца дзве стыхіі: няўрымслівa – неспакойны

вецер і памяркоўны ручай. Вобраз адзінокага дрэва ў шмат якіх адносінах увасабляе рысы беларускага народа (трываласць, жыццяздольнасць, аседласць), а сяброў – суседзяў сімвалізуюць вецер і ручай, якія спрабуюць перацягнуць Дрэва кожны на свой бок, а затым проста пакідаюць яго. У гэтай коласаўскай казцы выразна прысутнічае аўтарскае меркаванне, што ў вобразе Дрэва выступае Беларусь. Зважаючы на той этап нацыягенеза і саму гістарычную атмасферу беларускага Адраджэння, імкненне да стварэння ўласнай дзяржавы, знаходжанне паміж двух суседзяў – заходняга і ўсходняга, якія дзеляць скарбы трэцяга – ўсё гэта гаворыць пра тое, што Дрэва – гэта Беларусь, а ручай і вецер гэта Польшча і Расія. І тады робіцца зразумелай апошняя фраза твора, агучаная крумкачом (народнае ўвасабленне мудрасці) – парада дрэву: трэба трывала стаяць на зямлі, трэба "пусціць глыбей карэнні ў зямлю" [3, с. 131], г. зн., Беларусі робіцца парада самадастаткова замацавацца ў сваіх тэрыторыях. Найбольш пашыраны ландшафт у казках Я. Коласа – лясавы, пры гэтым зараслявыя прошчы лесу і заварожваюць, і палохаюць чалавека. Яго герой хоць і збярог шматлікія прыродныя інстынкты, але ўсё роўна – дзіця цывілізацыі. Свет дзікай прыроды, апошнім прыстанішчам якога застаюцца лясавыя прошчы, хоць і родныя сучаснаму чалавеку (паколькі лес – калыска чалавецтва), але значна ім забытыя. У адрозненні ад утрымліваючага небяспеку леса, сад, як і аздобленае поле у Коласа, больш добрыя да чалавека, але разам з самім чалавекам і слабыя перад вечнасцю, так як чалавек у сваёй гісторыі па прынцыпу варожы лесу – так павялося з часоў падсечнага земляробства. Але коласаўскія казачна – мудрыя ўзгадкі сцвярджаюць, што прыроднае асяроддзе па сваіх памерах значна шырэйшае, чым грамадства, якое ўзнікае, функцыянуе і развіваецца ўнутры яго.

Казка "Жывая Вада" распавядае як шчасце людзей, якія жылі каля ракі, было перапынена Гарой, якая пачала вытыркацца з-пад зямлі і знішчыла ўсё жывое, ператварыла акаляючае наваколле ў Мёртвае поле. Жывая Вада заставалася пад зямлёй, і яна паціху размываючы зямлю, незаўважна прабівала сабе дарогу на волю. Ніхто гэтага не ведаў. Не адчувала гэтага і Гара, што вісела над безданнем. Жывая Вада скінула з сябе Гару і аджывіла Мёртвае Поле, на якім доўгі час жыў і бедаваў народ. Гара, якая не дае жыць цэламу народу і ператварае край у "мёртвае поле" – гэта

самаўладдзе, а “жывая вада” – гэта беларускі народ. У казцы “Жывая Вада” сюжэтна сцвярджаецца, што людзі ніколі не бачаць працы “крата гісторыі”, бо яна выконваецца ціхімі прыхаванымі рухамі. Вынікі яе часцей за ўсё выходзяць на паверхню знянацку, нечакана. Чырвонай стужкай тут праводзіцца думка Я. Коласа, што рухальнай сілай сацыяльнага прагрэса выступае мудрасць народа, у якой абагулены вопыт штодзённага выжывання – праз кантакты з прыроднымі з’явамі на працягу вякоў – гэта і ёсць народная навука, ці протанавука. У казцы “Хмарка” Я. Колас малюе шлях галоўнай гераіні да ўсвядамлення сябе часткай роднага краю. “Безродная” Хмарка – гэта ўвасабленне схільнасці “нашай душы – бачыць усё добрае і прыгожае ў тым, што далёка ад нас, што не з намі”. Так і Хмарка блукала па свеце, як “заклятая”, пакуль не вярнулася ў той “край, адкуль і выйшла”. З вуснаў Старога Дуба (сімвал моцы і дамавітасці) гучыць ідэя сваёй зямлі, раскрытая праз вельмі характэрныя для літаратуры таго часу матывы роднага кута і працы: “моцна накажы ты ім, дружа, каб не лёталі дарэмна па свеце, не бадзяліся: у сваім родным кутку работы досыць для кожнага” [3, с. 141]. Я.Колас прызнаваў наяўнасць маральнасці ў раслінным і жывёльным свеце, тым самым аддаваў прыярытэт пачуццям і ў грамадскім жыцці. Але яго этыка не з’яўляецца натуралістычнай, бо яе аснову складаюць паняцці ўзаемадапамогі, справядлівасці, самаахвярніцтва, вялікадушнасці. Пагэтаму сістэмнасць і філасафічнасць здумлення Якуба Коласа, энцыклапедызм і ўніверсальнасць яго светабачання абумовілі раскрыццё поглядаў на прыроду праз агульныя пытанні эстэтыкі пісьма. Вобласць прыроды прадстае ў Я. Коласа як арганічна – цэлае быццё, свет складаецца з прыватных з’яваў, пранізаных адной агульнай сілай прыгажосці і гармоніі. У казках асобныя фрагменты прыроды імкнуцца зліцца ў адзінае непадзельнае, цэлае. Адметнасці прыроды, яе векавечная зменлівасць і рухомасць уплываюць на фізіягноміку не толькі як адзінкавай Асобы, але і цэлага народа. У казках Я. Коласа адсутнічаюць якія – небудзь экзатычныя расліны, затое шырока прадстаўлена флора беларускай зямлі: у лесе акрамя дрэваў растуць мхі і травы, грыбы і ягады.

З маладым насеннем ліпы, якому аднойчы дужа захацелася кінуць тутэйшы грунт і перабрацца туды, за далягляд бачанага, ніякай бяды пакуль не здарылася. Насенне ліпы было проста

здзіўлена, што тая прыцягальная сіняя далеч, якая на адлегласці здавалася накшталт зямнога раю, зблізку паўстала ў іньшым, больш празаічным і меньш прывабным выглядзе: няўжо гэта тыя самыя малюнкі, на якія глядзела яна так нядаўна? А дзе іх хараство, дзе тыя гладкія абрысы, дзе грабяні, што так павабна выглядалі, адтуль з ліпы? А палоскі лясоў? Нават сама рэчка не такая, якою здавалася здалёк. Нейкі неспакой пачынаў агортваць маладое насенне" [3, с. 159]. Коласаўская казка "Даль" заканчваецца: маладому насенню давядзецца прыкласці яшчэ шмат высілкаў, каб усвядоміць, што само жыццё няўмольна запатрабуе ад кожнага насельніка зямлі ўменне і падрыхтаванасці адрозніваць вонкавыя і нярэдка падманныя (і заманлівыя) праявы рэальнасці ад сапраўднай іх сутнасці. Сярод асноўных фларыстычных матываў у "Казках жыцця" Я. Коласа вылучаюцца два адзіныя ў сваёй супрацьлегласці "абараняльныя" матывы. Першы (і галоўны) з іх – пафас зберажэння расліннага асяроддзя роднай прыроды ад вынішчэння, так як вынікі чалавечай дзейнасці выступаюць не толькі і не столькі доказнасцю чалавечай мудрасці, але і апыняюцца парушальнікамі планетарнай раўнавагі; другі – абараняльная роля самой прыроды ў адносінах да беларускага народа, які часта ў хвіліну смяротнай небяспекі менавіта ў роднай зямлі і насяляючых яе раслін просіць і знаходзіць абарону. Я. Колас меней увагі надае асобным прадстаўнікам флоры, чым пейзажу ўвогулле, ён майстар захавання ландшафтных карцін. І яны болей эпічныя, чым лірычныя.

Аўтар "Казак жыцця" паэтызуе такі прыродны ланшафт як балота – малапрыцягальны ў вачах большасці людзей. Балоты заўсёды былі для людзей таямнічым светам: нязвыклыя гукі, калыхлівая дрыгва і сучкаватыя крывыя дрэўцы спараджалі вобразы балотных пачвараў – нячысцікаў. У Коласа балота ўтрымлівае асацыяцыі з вечнасцю і ўстойлівасцю.Чалавек шмат чым абавязаны балотам і ў першую чаргу ачышчэннем імі атмасферы – гэта своеасаблівыя ныркі ландшафта, так як торф паглынае таксічныя рэчывы і насычае паветра кіслародам. Сюжэт казкі "Балотны агонь" наступны: Бярозка, заціснутая з усіх бакоў дрэвамі, не бачыла сонца, рэдка калі на яе палыхаў свежы вецер. Адна толькі ўцеха падтрымлівала яе: уночы ёй віднелася як гарэў дзесьці агонь, неразгаданы, захапляльны і такі прыемны. І блішчэў той агонь з – пад нізу, з нейкіх невядомых абшараў зямлі. Затым Вяз

пратлумачыў ёй, што гэта не агонь, а гнілякі на балоце свецяцца, і параіў Бярозцы забыць пра іх: у дрэва павінна быць дзве дарогі – адна ў зямлю, другая ў гару да сонца. Дрэвы заспрачаліся: ці добра зрабіў Вяз, развеяўшы гэты прыгожы туман знешняга шчасця беднай бярозкі? І да гэтага часу дрэвы вядуць спрэчку [3, с. 146]. Я. Колас тут праводзіць думку, што пераход ад эмпірычна назіральных фактаў эстэтычных адносін чалавека да спасціжэння сутнасці гэтых адносін, якія схопліваюцца ў абстракцыі, уяўляюць складаны і супярэчлівы працэс. Пагэтаму адзіная рэальнасць прыгожага – яго рэальнасць у чалавечай свядомасці. Эстэтычная асалода – ёсць самаасалода, якая ўвасабляе сябе ў пачуццёвых прадметах і атрымлівае асалоду ад іх.

Літаратура

1. Гусоўскі, М. Песня пра зубра / М. Гусоускі. - Мінск, 1981.

2. Колас, Я. Новая зямля / Я. Колас. - Мінск, 1975

3. Колас, Я. Раніца ў нядзельку. Казкі жыцця / Я. Колас - Мінск, 1997.

***Семенова Л. Н.*** **Западная граница Евразийского пространства**

Выделение социально-культурных регионов происходит в ходе общественно-политических процессов и научных дискуссий. Пространство диалога между странами – результат доброй воли граждан и государств, цивилизационное пространство – результат культурного творчества, пространство региональной интеграции – результат экономического взаимодействия и политических решений государств. Однако органичность и устойчивость подобных пространств определяются закономерностями регионального развития: геополитическим смыслом месторасположения, потребностями хозяйственных комплексов и технологических зон, этническим и культурным притяжением, которые должны быть грамотно учтены при определении политического выбора.

Формирование в общественном сознании концепта Евразии и определение евразийских границ всегда было делом неоднозначным и спорным. Если южные и восточные границы евразийского пространства тяготели к природно-географическим: к горным